УДК 811.161.3:371.3

А. М. Шубадзёрава
дацэнт кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін
Магілёўскага інстытута МУС,
кандыдат філалагічных навук, дацэнт
(Рэспубліка Беларусь)

ТЭКСТ ЯК АСНОВА ПРАФЕСІЙНА АРЫЕНТАВАНАГА ВЫКЛАДАННЯ ДЫСЦЫПЛІНЫ «БЕЛАРУСКАЯ МОВА (ПРАФЕСІЙНАЯ ЛЕКСІКА)»

У артыкуле аналізуюцца метадалагічныя падыходы да навучання прафесійнай лексіцы. У якасці асновы для засваення спецыялізаванай тэрміналогіі прапанавана выкарыстанне тэкстаў, якія забяспечваюць увядзенне лексічных адзінак у кантэкст іх прафесійнага прымянення. Прыводзяцца крытэрыі адбору тэкставага матэрыялу, называюцца асноўныя патрабаванні да тэкстаў розных стыляў, якія можна выкарыстоўваць у працэсе вывучэння юрыдычнай лексікі. Падкрэсліваецца значнасць лексічных уменняў і навыкаў у працэсе фарміравання лексічнай кампетэнцыі.

Важную ролю ў падрыхтоўцы спецыялістаў праваахоўнай сістэмы адыгрывае прафесійна арыентаванае вывучэнне спецыяльнай лексікі. Дысцыпліна «Беларуская мова (прафесійная лексіка)» накіравана на тое, каб будучыя спецыялісты змаглі выкарыстоўваць асноўныя паняцці і тэрміны спецыяльнай лексікі беларускай мовы ў прафесійнай дзейнасці. У выніку засваення вышэйназванай дысцыпліны навучэнцы павінны ведаць сістэму лексічных, граматычных і стылістычных сродкаў беларускай мовы; мець уяўленне пра тэрміналагічныя слоўнікі і даведнікі па адпаведных сферах навукова-прафесійнай дзейнасці; умець граматна карыстацца вуснай і пісьмовай мовай; адэкватна ўспрымаць прафесійныя тэксты і навуковую галіновую інфармацыю; валодаць навыкамі перакладу, анатавання і рэферыравання прафесійна арыентаваных тэкстаў; навыкамі складання і вядзення на беларускай мове дзелавой дакументацыі, падрыхтоўкі навуковых і публічных выступленняў.

Актуальнай задачай навучання беларускай мове для спецыяльных мэт у ведамасных вышэйшых навучальных установах з'яўляецца фарміраванне прафесійна арыентаванай лексічнай кампетэнцыі. Даследчыкамі неаднаразова адзначалася, што паспяховасць засваення моўных сродкаў, неабходных для вырашэння прафесійных задач, залежыць ад сістэмнага фарміравання ў навучэнцаў здольнасці аперыраваць спецыялізаванай тэрміналогіяй. Гэта палажэнне знаходзіць адлюстраванне ў навуковых і навукова-метадычных працах

айчынных і замежных вучоных, такіх як Л. С. Васюковіч [1], В. І. Жданько [2], Р. З. Байбурына [3] і інш.

Прафесійна арыентаваная лексічная кампетэнцыя — здольнасць выкарыстоўваць лексічныя адзінкі ў працэсе прафесійнай дзейнасці — з'яўляецца важным складнікам камунікатыўнай кампетэнцыі, якая выступае дзейсным сродкам падрыхтоўкі спецыялістаў розных профіляў, забяспечваючы іх гатоўнасць да эфектыўных зносін у прафесійным асяроддзі.

У якасці лексічных адзінак звычайна выступаюць словы, устойлівыя спалучэнні слоў. Выбар лексічных адзінак і фарміраванне спецыялізаванага лексічнага пласта звычайна абумоўліваецца патрэбамі прафесійнай сферы (для праваахоўных органаў — юрыспрудэнцыі). Важнымі аспектамі лексічнай кампетэнцыі з'яўляюцца лексічныя веды, уменні і навыкі, якія выяўляюцца ў здольнасці навучэнцаў знаходзіць патрэбнае значэнне лексічнай адзінкі, выкарыстоўваць слова ў адпаведным кантэксце. Аднак, як адзначае В. Г. Старадубцава, азначэнне паняцця «лексічная кампетэнцыя» было б няпоўным, «калі б не ўключала ў свой склад моўны, маўленчы вопыт і асабістыя якасці навучэнцаў» [4, с. 128].

Многія даследчыкі (В. І. Жданько, А. М. Шамаў) у методыцы фарміравання прафесійна арыентаванай лексічнай кампетэнцыі вылучаюць некалькі этапаў [2; 5]. На думку В. І. Жданько, развіццё лексічнай кампетэнцыі пачынаецца з тлумачэння новага прафесійна арыентаванага лексічнага матэрыялу для яго самастойнага засваення, другі этап — замацаванне і аўтаматызацыя лексічных уменняў і навыкаў, на трэцім этапе ўсе заданні накіраваны на выкарыстанне лексікі ў рэальнай камунікацыі, такім чынам адбываецца набліжэнне маўленчай дзейнасці навучэнца да дзейнасці будучага спецыяліста.

На кожным этапе фарміравання лексічнай кампетэнцыі важную ролю адыгрывае тэкст, які з'яўляецца асноўнай адзінкай моўнага матэрыялу. Тэкст не толькі дае магчымасць асэнсоўваць прафесійныя словы і тэрміналагічныя спалучэнні, але і выступае метадалагічнай асновай для фарміравання ў навучэнцаў устойлівых навыкаў маўленчай дзейнасці.

У тэкстах моўны матэрыял паўстае ў яго натуральным функцыянаванні, адбываецца сінхроннае ўзаемадзеянне ўсіх узроўняў моўнай сістэмы. Тэкст заўсёды адлюстроўвае пэўныя ментальныя характарыстыкі носьбітаў дадзенай мовы, што важна пры фарміраванні камунікатыўнай кампетэнцыі навучэнцаў.

Навучанне прафесійнай лексіцы прадугледжвае выкарыстанне тэкстаў розных жанраў, у першую чаргу навуковых, і гэта невыпадкова. Перш чым пачаць працаваць з тэкстам па спецыяльнасці, навучэнец павінен добра ведаць асаблівасці навуковага стылю, трывала валодаць агульнанавуковай лексікай, засвоіць канструкцыі, характэрныя для навуковага тэксту, мець уяўленне

пра асноўныя спосабы перадачы інфармацыі ў навуковым тэксце (апісанне, разважанне, апавяданне), каб зразумець, якую структуру мае кожны тып маўлення і якімі сродкамі забяспечваецца лагічнасць і звязанасць тэксту.

Пры вывучэнні прафесійнай лексікі, акрамя навуковых, варта выкарыстоўваць і публіцыстычныя тэксты, якія валодаюць высокай інфарматыўнасцю, навізной, спрыяюць рознабаковаму развіццю навучэнцаў, а таксама маюць высокі выхаваўчы патэнцыял. Найбольш прыдатныя для заняткаў па дысцыпліне «Беларуская мова (прафесійная лексіка)» тэксты, арыентаваныя на актуальныя праблемы забеспячэння правапарадку і бяспекі, асаблівасцей барацьбы са злачыннасцю, прымянення новага заканадаўства, папулярызацыю перадавога вопыту праваахоўных ведамстваў, прапаганду здаровага ладу жыцця і г. д. Добрую дапамогу пры адборы тэкстаў такой тэматыкі акажуць ведамасныя часопісы і газеты.

Важнае значэнне для засваення юрыдычнай тэрміналогіі маюць тэксты афіцыйна-дзелавога стылю, якія традыцыйна выклікаюць найбольшую цяжкасць для навучэнцаў, бо насычаны вузкаспецыяльнымі тэрмінамі, складанымі фармулёўкамі і клішэ, вельмі грувасткімі сінтаксічнымі канструкцыямі. Аднак праца са спецыяльнымі дакументамі правазнаўчага характару — найпершы абавязак будучых спецыялістаў праваахоўных органаў.

Абагульняючы сказанае, трэба адзначыць, што тэкст адыгрывае ключавую ролю ў вывучэнні прафесійнай лексікі. Выкарыстанне ў вучэбным працэсе прафесійна арыентаваных тэкстаў садзейнічае фарміраванню лексічнай кампетэнцыі, а таксама дазваляе прааналізаваць сітуацыі, з якімі давядзецца сутыкнуцца навучэнцам у іх будучай працы, і такім чынам закласці асновы паспяховай прафесійнай дзейнасці.

1. Васюковіч Л. С. Лінгваметадычная сістэма інтэграванага фарміравання прадметных і метапрадметных кампетэнцый навучэнцаў сродкамі ўніверсальнага вучэбнага тэксту сучаснага падручніка беларускай мовы : аўтарэф. дыс. … д-ра пед. навук : 13.00.02 / Нац. ін-т адукацыі. Мінск, 2022. 52 с. Вярнуцца да артыкула

2. Жданько О. И. Методика формирования профессионально ориентированной лексической компетенции обучающихся в техническом вузе : автореф. дис. … канд. пед. наук : 13.00.02 / Нижегород. гос. лингв. ун-т. Н. Новгород, 2016. 25 с. Вярнуцца да артыкула

3. Байбурина Р. З. Методика формирования профессионально ориентированной лексической компетенции у обучающихся юридического вуза // Вестн. Уфим. юрид. ин-та МВД России. 2023. № 2 (100). С. 137–143. Вярнуцца да артыкула

4. Стародубцева О. Г. Лексическая компетенция как языковая основа профессионально-коммуникативной компетенции студентов неязыкового вуза // Бюл. сибир. медицины. 2013. Т. 12, № 3. С. 127–131. Вярнуцца да артыкула

5. Шамов А. Н. Лексические навыки устной речи и чтения — основа семантической компетенции обучаемых // Иностранные языки в школе. 2007. № 4. С. 19–21. Вярнуцца да артыкула

A. M. Shubadziorava

Text as a basis for professionally oriented teaching of the discipline «Belarusian language (professional vocabulary)»

The article analyzes methodological approaches to teaching professional vocabulary. As a basis for mastering special terminology it is proposed to use texts that familiarize with lexical units in the context of their professional application. The criteria for selecting text material are given, as well as the main requirements for texts of different styles that can be used in the process of learning legal vocabulary. The importance of lexical skills in the process of forming lexical competence is emphasized.